ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

● № 12 (846) ● Чацвер, 20 красавіка 1972 г. ● Год выдання XXV ● Цана 2 кап.

## ВЯЛІКАМУ ЮБІЛЕЮ РАДЗІМЫ

Агульны сход партыйнай арганізацыі універсітэта, які адбыўся на мінулым тыдні, абмеркаваў ход падрыхтоўкі у БДУ да паўвекавога юбілею Савецкай дзяржавы. З дакладам выступіў прарэктар універсітэта С. А. Умрэйка.

Дакладчык і выступіўшыя у спрэчках камуністы тт. Раманоўскі, Слука, Новікаў, Малашка, Булацкі, Чыгір гаварылі аб неадкладных задачах сённяшняга дня па паспяховаму завяршэнню навучальнага года, аб Ленінскім заліку у камсамольскай арганізацыі, аб рознабаковай лекцыйнай прапагандзе у падшэфных калектывах, выкананні сацыялістычных абавязацельстваў.

У прынятай пастанове адзначана, што падрыхтоўка да юбілею СССР праходзіць у БДУ ў рэчышчы шырока разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва па выкананню гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Асаблівая ўвага звернута на вывучэнне пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя утварэння СССР».

Партыйным арганізацыям прапанавана устанавіць строгі кантроль за выкананнем сацыялістычных абавязацельстваў і планаў падрыхтоўкі да юбілею, распрацаваных факультэтамі, кафедрамі, выкладчыкамі і студэнтамі.

Намечана стварыць тэматычную наглядную агітацыю. Рэдкалегіям газеты «Беларускі універсітэт» і насценных газет пастаўлена ў абавязак сістэматычна публікаваць матэрыялы, прысвечаныя 50-годдзю СССР.

**Наш кар.**

# СВЯТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

## ГЕАФАК

Варта было выйсці 15 красавіка на вуліцы нашага горада і паглядзець навокал. Усюды працавалі людзі. Дружна, радасна, весела.

У камітэце камсамола геаграфічнага факультэта вось што расказалі аб прайшоўшым свяце працы.

— На суботнік выйшла больш 400 студэнтаў і выкладчыкаў, — гаворыць сакратар камітэта Віктар Раманаў. — Праўда, яшчэ раней пачын зрабілі першакурснікі. Яны працавалі 9 красавіка на базе Будмантажпоезда. Нават грамату атрымалі ад дырэкцыі прадпрыемства. 15 красавіка другі і трэці курсы наводзілі парадак у інтэрнаце № 5 і у геаграфічным корпусе. А закончым мы усенароднае свята працы 21 кастрычніка, калі студэнты старэйшых курсаў будуць працаваць у Кастрычніцкім райкамгасе. Вось тады можна будзе і вынікі падвесці.

Звяртаюся да сакратара камсамольскага бюро І курса Сашы Крэйкіна:

— Які настрой пасля працы?

— Выдатнейшы! Часцей бы так разам збірацца.

І, нарэшце, маёй субяседніцай аказалася Галя Тарatынка, студэнтка І курса. У яе шмат добрых уражанняў.

— Здаецца, час праляцеў хутка-хутка. Працавалі з 9 да 13 гадзін. Хлопцы перакладвалі цэглу, а мы насілі дошкі, укладвалі іх для прасушкі.

— Назаві, калі ласка, лепшых.

— Тамара Чаркасава, Таня Казюкіна, Люда Гладкая, Міша Кудзін, Алёша Барысевіч... Ды наогул усе працавалі выдатна. Калі б была неабходнасць усё перавесці ў норму, упэўнена, што кожны выканаў бы сваё заданне на 150—200 працэнтаў.

**У. СКУЛЬБЕДАЎ.**

## ЮРФАК

«Усе на камуністычны суботнік!» — гэты заклік дружна падтрымалі студэнты юрыдычнага факультэта. Загадзя камітэтам камсамола факультэта былі размеркаваны аб'екты працы, дні выхаду на суботнік. Напрыклад, з 1 па 12 красавіка студэнты кожны дзень групамі па 30 чалавек працавалі на стадыёне БДУ, добраўпарадкоўвалі яго тэрыторыю.

15 красавіка стаў агульным днём камуністычнай працы для ўсіх курсаў. Добра папрацавалі студэнты IV курса на ўборцы тэрыторыі цагельнага завода. Шчырае дзякуй і Ганаровая грамата — узнагарода за добрасумленную працу. Падзяку атрымалі і студэнты III курса, для якіх аб'ектам ударнай працы быў завод медпрэпаратаў. Не забыліся будучыя юрысты і пра свой інтэрнат № 5. Там таксама дружна папрацавалі ў гэты дзень яго жыхары.

**Т. ФІЛІМОНАВА.**

## ГІСТФАК

Суботняй раніцай шматлікая армія студэнтаў запоўніла вуліцы Кастрычніцкага раёна. Камуністычная субота з'явілася для юнакоў і дзяўчат наглядным сведчаннем будняў камунізму. Аб гэтым гаварылі актыўнасць, згуртаванасць, масавасць і сам вынік працы студэнтаў.

— 735 будучых гісторыкаў прыводзілі у парадак вуліцы Зялёную, імя Казінца і іншыя, працавалі на тэрыторыі свайго універсітэта,—расказаў сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта Міхаіл Мурашка.

Асабліва добра працавалі студэнты першага, трэцяга курсаў, такія, як Віктар Фядосін, Аляксандр Позняк і іншыя.

**П. ДЗІМІН.**



*Актыўны удзел у камуністычным суботніку прынялі і замежныя студэнты. НА ЗДЫМКУ: ідуць на працу навучэнцы падрыхтоўчага факультэта.*

Фота *М. Нечыпарэнкі.*



## ФІЗФАК

А на самым вялікім факультэце —фізічным суботнік яшчэ працягваецца. Студэнты працуюць па графіку, складзенаму спецыяльным штабам. З 3 красавіка кожны дзень выходзяць групы фізікаў на вуліцы Кастрычніцкага раёна, акопваюць дрэвы, газоны.

15 красавіка студэнты фізфака працавалі на будаўніцтве, у карпусах факультэта, на ваеннай кафедры, у інтэрнаце № 7.

Звыш сваіх графікаў працавалі на суботніку будаўнічыя атрады. Гэта была добрая рэпетыцыя для іх перад працоўным семестрам.

**Н. САЛУК.**

□□

**Эстэтыка працоўнага месца патрабуе ад супрацоўнікаў кафедры электронных матэматычных машын і вось такіх фізічных затрат.**





**НА ЗДЫМКУ: не горш, чым з вылічальнай тэхнікай, спраўляюцца матэматыкі і з такой старажытнай прыладай працы, як лапата.**

Фота Д. Чаховіча.

## ЖУРФАК

Роўна ў восем гадзін староста першай групы II курса факультэта журналістыкі прама ў аўтобусе правёў пераклічку. Усе на месцы.

— Можна кранацца, — гаворыць вадзіцелю куратар групы І. І. Сачанка.

І адразу, як па камандзе, узляцела песня камсамольскага юнацтва. Хвілін праз трыццаць мы ўжо на ўскраіне горада, на вялікай новабудоўлі рыбкамбіната.

— Патрэбна пяць чалавек — здаровых, моцных мужчын — на асабліва цяжкую працу: пераносіць металічныя канструкцыі.

Выходзяць пяцёра былых воінаў: Арцюшкевіч, Барысенка, Драздоў, Дым і Аксяневіч, які і узначаліў ударную пяцёрку.

Адна група дзяўчат працуе на ўборцы тэрыторыі, другая— аднаго з будучых цэхаў камбіната. А спартсменам-цяжкаатлетам Пятру Дзетліковічу і Віктару Кубеку даручылі пракладку траншэі на бетаніраванай пляцоўцы.

Спрытна і хутка разбіраюць жалезную арматуру Мікалай Маркевіч і Вячаслаў Лапцік.

Закончыўшы работу, мы пацікавіліся, які аб'ём працы выканалі.

— Адразу сказаць нельга, — адказвае прараб В. Ц. Навуменка, — але тое, што вы аказалі вялікую дапамогу, бясспрэчна. Вялікае вам дзякуй. Малайцы, таварышы камсамольцы!

**М. ПЯТНІЦА.**




## ВОСЬ ТАК І ЖЫВЁМ

На прайшоўшым нядаўна конкурсе наша група заняла першае месца па факультэту. Вядома, такі вынік вельмі парадаваў нас. Прыемна быць першымі, тым больш на самым вялікім факультэце.

Чаму іменна наша група дабілася такога поспеху? З першай жа сесіі яна выйшла на адно з першых месц па паспяховасці, такімі ж былі вынікі астатніх сесіі. Сярэдні бал утрымліваецца высокі, не ніжэй «4». Камсамольскае бюро і актыў шмат увагі удзялялі паспяховасці, таму што галоўная наша задача — вучоба. Мы праводзілі камсамольскія сходы, на якіх абмяркоўвалася паспяховасць студэнтаў, раіліся, што зрабіць, каб яе павысіць. Быў час, напрыклад, калі ў групе панізіўся ўзровень падрыхтоўкі да семінараў па грамадскіх навуках, некаторыя студэнты перасталі весці канспекты. Каб выправіць такое становішча, быў праведзен адкрыты камсамольскі сход, на якім камсамольцы прынялі рашэнне: ліквідаваць пропускі семінараў без уважлівых прычын і прывесці у парадак канспекты у 2-тыднёвы тэрмін. Гэтую пастанову мы выканалі і экзамен у сесію здалі паспяхова.

Вядома, вялікую ролю адыгрываюць і дысцыпліна, сур'ёзныя адносіны да камсамольскіх і грамадскіх даручэнняў. Правільна гаворыцца, што патрабаванні вызначаюць адносіны да работы. Неабходна строга сачыць за выкананнем камсамольскіх даручэнняў. Прывяду прыклад. У пачатку гэтага навучальнага года у групе зусім перасталі праводзіцца палітінфармацыі. Выявілася, што прычына гэтага — нядбайныя адносіны.

Камсамольскі сход пастанавіў: паставіць на від адказнаму за правядзенне палітінфармацый і абавязаць яго наладзіць работу. Што ж, меркаванне групы многае значыць. Больш размоў аб правядзенні палітінфармацый не ўзнікала.

Вельмі многае у камсамольскай рабоце залежыць ад узаемаадносін студэнтаў, ад агульнага настрою ў групе. Наша група дружная, і гэта дапамагае нам добра вучыцца і добра адпачываць. Сапраўды, трэба было адпачыць пасля двух семестраў вучобы і трэцяга працоўнага. І мы пайшлі у паход у Карэлію. Пабывалі ў Кіжах, на вадаспадзе Ківач, у Петразаводску, у Ленінградзе, у Кемі. Колькі песень было праспявана вечарамі ля кастра, колькі кіламетраў пройдзена па цудоўных асенніх дарогах Карэліі! Як многа даў нам гэты паход. А наперадзе яшчэ шмат дарог. Пажадайце ж нам поспеху!

**Н. АКУНЁВА,**
камсорг 13-й групы
III курса фізфака.

СССР 50

*У год юбілею нашай слаўнай шматнацыянальнай краіны мы з асаблівай цікавасцю знаёмімся з рознабаковым жыццём братніх рэспублік СССР, іх навукай, культурай, мастацтвам, навучальнымі установамі.*

*Сёння дзве старонкі нашай газеты расказваюць аб самым паўночным у краіне Петразаводскім універсітэце імя О. В. Куусінена Карэльскай АССР.*

# Петрозаводский Университет



## САМЫ ПАЎНОЧНЫ Ў КРАІНЕ

**Універсітэт, педагагічны інстытут, філіял Ленінградскай кансерваторыі — тры вышэйшыя навучальныя ўстановы ў сталіцы Карэльскай АССР Петразаводску. Вучыцца ў іх 11.000 студэнтаў.**

**Наша ВНУ —Петразаводскі дзяржаўны універсітэт імя О. В. Куусінена — самы паўночны універсітэт у краіне — яшчэ малады. Ён заснаван у ліпені 1940 года. Першыя заняткі ў ПДУ (тады Карэла-Фінскім універсітэце) пачаліся 1 верасня 1940 года.**

**У Петразаводскім універсітэце на васьмі факультэтах — гісторыка-філалагічным, фізіка-матэматычным, медыцынскім, біялагічным, сельскагаспадарчым, лесаінжынерным, будаўнічым і агульнатэхнічным — па 14 спецыяльнасцях навучаецца 7.000 студэнтаў.**

**Цяпер Петразаводскі універсітэт — адна з буйнейшых ВНУ Паўночнага Захаду краіны. У яго саставе 54 падраздзяленні, у тым ліку 17 кафедр і 3 самастойныя курсы, вылічальная лабараторыя, батанічны сад і Канчазерская біялагічная станцыя.**

**Навуковыя сілы ПДУ — 528 прафесараў, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў (31 доктар навук, 216 дацэнтаў, кандыдатаў навук). Акрамя таго, у навуковай рабоце прымаюць удзел 278 супрацоўнікаў, 35 аспірантаў і 1.556 студэнтаў.**

**Год ад году расце матэрыяльна-тэхнічная база нашай ВНУ. Студэнты займаюцца ў чатырох карпусах. У канцы мінулага года ўведзен новы інтэрнат (цяпер іх у нас стала 6), нядаўна здадзена ў эксплуатацыю цэнтральная навуковая лабараторыя біяфака і медфака (віварый). Ідзе будаўніцтва вучэбнага корпуса для нашых інжынераў.**

## ХРОНІКА

На гістарычным факультэце уведзен спецкурс па грамадска-палітычнай рабоце ў будаўнічых арганізацыях. Да чытання лекцый на грамадскіх асновах прыцягнуты сакратары партыйных арганізацый будаўнічых трэстаў, старшыні будкомаў, арганізатары тэхвучобы, юрысты.

***

Вучобу камсамольскіх сакратароў, намеснікаў сакратароў бюро факультэтаў, аддзяленняў і курсаў праводзілі не ў прывычнай, аудыторнай абстаноўцы, а на турбазе «Касалма».

Заняткі ішлі па секцыях. Былі абмеркаваны пытанні аб удасканаленні ідэалагічнай і арганізатарскай работы на факультэтах.

***

На сельскагаспадарчым факультэце прайшла навуковая студэнцкая канферэнцыя. У яе рабоце прынялі ўдзел госці з Эстонскай, Літоўскай і Беларускай сельскагаспадарчых акадэмій, а таксама з Мардоўскага універсітэта.

***

Вядучыя выкладчыкі біяфака універсітэта, а таксама старшакурснікі гэтага факультэта з'явіліся арганізатарамі I рэспубліканскай алімпіяды юных біёлагаў Карэліі.

У трох турах гэтай алімпіяды прынялі ўдзел вучні 7—10-х класаў. Пераможцы другога раённага тура сабраліся ва універсітэце на заключны агляд. З ліку прадстаўнікоў 16 раёнаў рэспублікі і 40 школьнікаў Петразаводска выяўлены лепшыя. Яны абаранялі гонар юных біёлагаў Карэліі на занальным туры алімпіяды ў Ленінградзе ў час вясенніх канікул.

***

З 9 па 19 мая ва універсітэце будзе адкрыта выстаўка дзіцячай выяўленчай і тэхнічнай творчасці, прысвечаная 50-годдзю Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна. У ёй прымуць удзел дзеці выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў ПДУ. Дэвіз выстаўкі — «Хай заўжды будзе сонца!»

## РАСЦЁМ РАЗАМ З РЭСПУБЛІКАЙ

Петразаводскі дзяржаўны універсітэт імя О. В. Куусінена яшчэ вельмі малады: у ліпені яму споўніцца 32 гады. Адкрыццё універсітэта ў Карэліі— праяўленне ленінскіх клопатаў Камуністычнай партыі аб развіцці навукі, культуры і асветы ва ўсіх рэспубліках шматнацыянальнага Савецкага Саюза.

У Карэліі, дзе да рэвалюцыі пісьменнасць мясцовага насельніцтва складала усяго 31 працэнт, у 30-я гады былі створаны дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы — педагагічны інстытут і вышэйшая сельскагаспадарчая камуністычная школа, у якіх вучыліся ў асноўным прадстаўнікі карэльскага, фінскага і вепскага насельніцтва рэспублікі.

За гады свайго існавання Петразаводскі універсітэт прайшоў цяжкі і слаўны шлях. Разам з усім савецкім народам наш універсітэт вынес цяжкія выпрабаванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нават у самыя грозныя гады вайны універсітэт не спыняў сваёй дзейнасці і працягваў працаваць у эвакуацыі ў горадзе Сыктыўкары Комі АССР.

Вярнуўшыся ў 1944 годзе ў Петразаводск, выкладчыкі і студэнты універсітэта ўбачылі поўнасцю разбураны вучэбны корпус. Згарэла бібліятэка, было разграблена вучэбнае і навуковае абсталяванне. Многія выкладчыкі і студэнты не вярнуліся з поля бітвы.

Пасляваенны перыяд гісторыі універсітэта, яго поспехі і клопаты непарыўна звязаны з бурным развіццём вытворчых сіл Карэльскай АССР. Падрыхтоўка спецыялістаў высокай кваліфікацыі арганічна спалучаецца з патрэбамі народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

У 1951 годзе, напрыклад, Петразаводскі універсітэт пачаў рыхтаваць спецыялістаў лясной прамысловасці, у 1960 годзе быў адкрыт медыцынскі факультэт, у 1961 годзе пачалася падрыхтоўка матэматыкаў-вылічальнікаў.

За 32 гады існавання Петразаводскі універсітэт ператварыўся ў буйную вышэйшую навучальную ўстанову Паўночнага Захаду краіны, стаў навуковым цэнтрам шматгаліновай гаспадаркі і культуры Карэліі і суседніх з ёй абласцей. За гэтыя гады было падрыхтавана больш 9000 маладых спецыялістаў, якія плённа працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, школах, бальніцах, леспрамгасах, саўгасах, на заводах. Многія нашы выхаванцы сталі вучонымі, заслужанымі настаўнікамі, вядомымі інжынерамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў і саўгасаў.

Ва універсітэце працуе высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў. Многія прафіліруючыя кафедры узначальваюць буйныя вучоныя, вядомыя ў нас у краіне і за мяжой. Многа энергіі і працы аддаюць справе навучання і выхавання студэнтаў прафесары О. П. Мінут-Сарахціна, В. А. Самсонаў, І. 1. Сюкіяйнен, М. А. Тойка, Е. А. Весялоў, І. М. Мендзялееў, М. М. Гін і іншыя.

Сярод выкладчыкаў нямала выпускнікоў ПДУ, якія прайшлі вялікую навуковую падрыхтоўку і сталі дактарамі і кандыдатамі навук. Былыя студэнты цяпер доктары навук: І. П. Лупанава, М. І. Шумілаў, дацэнты М. Я. Крывон-



кіна, А. В. Кузняцоў, М. П. Міронава.

Вучоныя універсітэта плённа вядуць навуковыя даследаванні па важных народнагаспадарчых праблемах. Аб'ём гаспадарча-дагаворных тэм, выконваемых па заказах прадпрыемстваў, складае штогадова звыш 300 тысяч рублёў.

Цесныя сувязі падтрымлівае наш універсітэт з іншымі ВНУ краіны. Маладыя выкладчыкі праходзяць падрыхтоўку ў мэтавай аспірантуры Ленінградскага універсітэта, Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі і іншых ВНУ. У сваю чаргу ў Петразаводскім універсітэце рыхтуюцца навуковыя кадры ВНУ аўтаномных рэспублік РСФСР: на медфаку вучацца аспіранты з Кабардзіна-Балкарскага і Дагестанскага універсітэтаў.

Наша ВНУ падтрымлівае сувязі з універсітэтамі Фінляндыі. Мы абмеўьваемся выкладчыкамі з Хельсінкскім універсітэтам.

Партыя і ўрад высока ацанілі дзейнасць вучоных Петразаводскага універсітэта: 19 прафесарам і выкладчыкам прысвоена званне заслужаных дзеячоў навукі РСФСР і Карэльскай АССР, многія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Вялікія перспектывы адкрываюцца перад ВНУ у дзевятай пяцігодцы. Будуць пабудаваны новыя карпусы і лабараторыі, павялічыцца прыём студэнтаў на большасць факультэтаў. Выкладчыкі абароняць 16 доктарскіх і больш 70 кандыдацкіх дысертацый.

Прафесары і выкладчыкі многа сіл аддаюць навуковай рабоце моладзі. Больш трэці студэнтаў займаецца ў гуртках навуковага таварыства. Штогод праводзяцца канферэнцыі НСТ, на якіх з дакладамі выступаюць студэнты ПДУ і госці з ВНУ Масквы, Ленінграда, Беларусі, Прыбалтыкі, рэспублік Закаўказзя, аўтаномных рэспублік Расіі.

Рыхтуючыся дастойна сустрэць паўвекавы юбілей утварэння СССР, калектыў універсітэта імкнецца яшчэ вышэй падняць узровень вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы, рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, дасканала валодаючых сучаснымі дасягненнямі навукі і тэхнікі, яшчэ больш настойліва змагацца за выкананне пачэсных задач, пастаўленых XXIV з'ездам КПСС перад работнікамі вышэйшай школы.

**В. СЦЕФАНІХІН,**
**рэктар Петразаводскага дзяржаўнага універсітэта, заслужаны дзеяч навукі КАССР, дацэнт.**



«Одра-1204» — новая электронна-вылічальная машына, нядаўна устаноўленая ў ПДУ. Выпушчана «Одра-1204» у Вроцлаве, устанаўліваць яе дапамагалі польскія інжынеры. Машына працуе на трох уваходных мовах—«алгол», «яск», «мост». Прымяненне «алгола» дазваляе карыстацца праграмамі іншых вылічальных цэнтраў.

У студзені-лютым ва універсітэце былі арганізаваны курсы для выкладчыкаў і супрацоўнікаў розных факультэтаў па вывучэнню «алгола». І цяпер з машынай могуць «размаўляць» не толькі фізікі і матэматыкі, але і аграномы, медыкі, лесаінжынеры, будаўнікі.

**На здымку:** матэматык-праграміст Людміла Марозава здымае паказанні рашэння чарговай задачы.

Фота **С. Півоева.**



Пасяджэнне інтэрклуба «Глобус» на гэты раз праходзіла ў гасцінай артыстычнага клуба УТТ. У «сямейных» абставінах інтэрклубаўцы прымалі новае папаўненне.

**На здымку:** ідзе пасяджэнне клуба «Глобус».

Фота **Б. КАЧНОВА.**

# ЖЫЦЦЁ, АДЛЮСТРАВАНАЕ Ў МУЗЫЦЫ

Вось ужо некалькі дзён у аўдыторыі, у гардэробе, у чарзе ў сталовую, у бібліятэцы я чую аб гэтым канцэрце.

— Ну як, спадабалася? Сам Хачатуран дырыжыраваў? А што выконвалі?

Калі ацэньваць састаў насельніцтва па запоўненых залах тэатраў, філармоніі, Палаца спорту, то здасца, што большасць жыхароў у горадзе — студэнцтва. Але так было заўсёды і ўсюды. Такі ўжо захоплены, няўрымслівы гэта народ. Шмат студэнтаў пабывала і на аўтарскім канцэрце народнага артыста СССР, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэміі Арама Ільіча Хачатурана. Канцэрт, які быў прысвечан 50-годдзю утварэння СССР, адкрыў у рэспубліцы дэкаду музыкі братніх народаў.

**Перад апошнім званком.** Яшчэ гарыць святло ў зале, яшчэ купляюць праграмкі і абмяркоўваюць праблемы дня тыя, каму прадстаіць стаць слухачамі. Наперадзе мяне, напэўна, першакурснікі гавораць аб цяжкім экзамене, які ім прадстаіць здаць. Зала... Колькі сустрэнецца тут сёння былых саслужыўцаў і аднакласнікаў, дэканаў і студэнтаў. Сёння іх яднае любоў да музыкі.

Гасне святло, і няма ўжо мазаічных радоў. Ёсць толькі ярка асветленая сцэна з аркестрам і дырыжор.

**Канцэрт.** Гучыць мелодыя, і забываюцца засмучэнні і заклапочанасць. Яна захапляе і падпарадкоўвае сабе.

Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускай ССР выконвае канцэрт-рапсодыю для скрыпкі з аркестрам армянскага кампазітара А. Хачатурана. Саліст — лаўрэат Міжнароднага конкурсу Павел Коган, дырыжор — дыпламант Усесаюзнага конкурсу Юрый Яфімаў.

З першых гукаў адчуваеш сакавіты каларыт усходніх мелодый, а дзесьці там, за кулісамі, прыслухоўваецца да выканання беларусаў-аркестрантаў аўтар: канцэрт-рапсодыя ў рэспубліцы выконваецца ўпершыню. Але слухачы з прыемнасцю прымаюць твор. Апладысментамі ўзнагароджваюць і канцэрт-рапсодыю для фартэпіяна з аркестрам — саліст лаўрэат міжнародных конкурсаў Уладзімір Крайнеў. Канцэртам для віяланчэлі з аркестрам — саліст лаўрэат міжнароднага конкурсу Карынэ Геаргіян, дырыжор аўтар — заканчваецца трыяда канцэртаў.

**Гледачы.** Яны сядзяць нерухома. Хто прыкрыўшы вочы і абапёршыся на руку падбародкам, хто напружана падаўшыся наперад. Твары то строгія, то прасветленыя... Справа ад мяне госці Мінска — рабяты-літоўцы. Ззаду цэлая група: студэнты універсітэта — пазнаю па юбілейных значках. Усе ўважліва слухаюць. Гучыць музыка к балету «Гаянэ»— балету, што прысвечан мужным вобразам савецкіх людзей: рускіх і армян, беларусаў і казахаў, украінцаў і малдаван... — іх барацьбе за Радзіму.

Знаю, што, напэўна, кожны ў гэтай зале — мой сусед, студэнт са значком хімфака ці дзяўчына, што прыйшла сюды са скрыпкай, відаць, адразу з музычных заняткаў, або наш выкладчык, што сядзіць у першых радах, — зможа штосьці расказаць аб творчасці армянскага кампазітара. Аб тым, як спяваў пад акампанемент сазы, кеманчы або тары бацька хлапчука — майстар пераплётнай справы ў Тбілісі, як запала з дзяцінства ў душу Араму сумная армянская мелодыя, што спявала яму маці. І потым гэтую мелодыю ён паклаў у аснову першай тэмы павольнай часткі Другой сімфоніі. Як прыехаў ён у Маскву і паступіў у тэхнікум імя Гнесіных, а затым у кансерваторыю, дзе кіраўніком яго быў вядомы савецкі кампазітар Н. Я. Мяскоўскі. І аб тым, як у 1924 годзе ішоў па асветленых кастрамі вуліцах Масквы сярод людзей розных нацыянальнасцей развітвацца з Ільічом, а праз паўгода напісаў «Оду памяці Леніна» к дакументальнаму фільму.

Мне раскажуць аб балетах «Спартак» і «Гаянэ» і аб многіх другіх творах — таму што творчасць Хачатурана любяць беларусы таксама, як і рускія, украінцы, грузіны.

**І зноў музыка.** Дырыжыруе А. І. Хачатуран. Гучаць фрагменты з балета «Гаянэ». Хуткі украінскі гапак змяняе «Рускі танец», а затым гучыць «Лезгінка» — гэтыя танцы братніх народаў нашай вялікай краіны, як палосы арнаментаў-мелодый на музыкальным дыване балета і як некалькі з мноства адбіткаў у творчасці ад падзей, людзей, успамінаў.

**Н. МАРАДУДЗІНА.**

## НАСУСТРАЧ ЮБІЛЕЮ

23 красавіка ў парку Перамогі праводзіцца вясенні крос, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. У ім прымуць удзел мацнейшыя лёгкаатлеты, члены зборных каманд універсітэта, Белсавета СДСТ «Буравеснік», БССР і СССР. Сярод іх: В. Бяляева, О. Шалыгіна, С. Рахманаў (хімфак); В. Краснапрошын, Т. Цімашкова (ФПМ); О. Ярута (біяфак), Н. Глебава (гістфак) і многія іншыя.

**Дарагія сябры! Азнаменуем святкаванне 50-годдзя ўтварэння СССР новымі спартыўнымі дасягненнямі і здачай нарматываў ГПА.**

**Усе на старт!**

**С. КАМІНСКІ.**

# МЫ З СЬЕРА-ЛЕОНЕ

**19 КРАСАВІКА 1972 ГОДА СПОЎНІЛАСЯ ПЕРШАЯ ГАДАВІНА З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ НОВАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў ЗАХОДНЯЙ АФРЫЦЫ — СЬЕРА-ЛЕОНЕ. У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ 27 КРАСАВІКА НАРОД ГЭТАЙ КРАІНЫ АДСВЯТКАВАЎ 10-ю ГАДАВІНУ З ДНЯ АБВЯШЧЭННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ.**

**У верасні 1971 года ў Мінск прыехала 6 прадстаўнікоў маладой рэспублікі. Цяпер яны займаюцца на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў нашага універсітэта.**

**Напярэдадні нацыянальнага свята мы папрасілі афрыканскіх студэнтаў падзяліцца ўражаннямі аб знаходжанні ў нашай краіне.**

— Мяне вельмі ўразіла Масква, яе высотныя будынкі, — гаворыць **Алхазіс Фафана**. — Калі я зайшоў у метро, то мне здалося, што я нібы знаходжуся ў казачным свеце. Мінск мне таксама вельмі спадабаўся. Асабліва яго людзі. Пабываўшы ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, я зразумеў, якія цяжкасці перажыў савецкі народ у гады выпрабаванняў. Я глыбока задумаўся аб тым, колькі пакут вынес народ зямлі беларускай, зямлі, на якой цяпер цвітуць сады, будуюцца гіганцкія заводы і фабрыкі, з нетраў якой здабываюцца карысныя выкапні.

І я невыпадкова выбраў для сябе прафесію горнага інжынера. Мне хочацца з роднай зямлі здабываць яе багацці сваімі рукамі і дарыць людзям алмазныя россыпы.

— Пасля заканчэння 14 класаў ліцэя я вырашыў вучыцца далей толькі ў Савецкім Саюзе, — гаворыць прэзідэнт зямляцтва студэнтаў з Сьера-Леоне **Коуль Джозэф**.—Спецыялістаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю ў СССР, вельмі высока цэняць у нашай краіне. Я хачу стаць інжынерам-энергетыкам. Прыехаўшы ў Савецкі Саюз, я вельмі здзівіўся, што тут нават у самых аддаленых месцах краіны цяпер у кожным доме гарыць святло.

**Тэйлар Гілберт** з ранняга дзяцінства марыў стаць інжынерам-суднабудаўніком.

— Суднабудаўніцтва — гэта адна з важнейшых праблем, якія стаяць цяпер перад нашай краінай. Сталіца Сьера-Леоне Фрытаун з'яўляецца адным з галоўных марскіх вузлоў у Заходняй Афрыцы. У цяперашні час у нас вельмі мала інжынераў-суднабудаўнікоў. І я ганаруся тым, што буду ў ліку першых спецыялістаў, падрыхтаваных у СССР.

Прыехаўшы ў Мінск, я вельмі палюбіў гэты горад. Палюбіў я і Беларусь. Раней я ведаў аб ёй толькі па яе трактарах і магутных БелАЗах. Цяпер я многае даведаўся пра Беларусь. Да глыбіні душы мяне крануў мемарыяльны комплекс Хатынь.

Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў нас, быў аб'яўлен міжнародны студэнцкі конкурс на лепшае сачыненне пра У. І. Леніна,—гаворыць **Ламін Мала**. — Пераможцам конкурсу стаў студэнт Фрытаунскага універсітэта Махамед Кімба. Яму была прадастаўлена магчымасць наведаць ленінскія мясціны ў Савецкім Саюзе.

Пасля прыезду ў Сьера-Леоне ён з цікавасцю расказваў усім маладым людзям аб гэтай захапляючай паездцы, аб цудоўных савецкіх людзях, якія будуюць камунізм па запаветах вялікага правадыра сусветнага пралетарыяту. І мы усе з вялікім хваляваннем чакалі таго дня, калі паедзем у гэтую дзівосную краіну.

— Мяне як будучага інжынера-будаўніка, — уступае ў размову **Джордж Камара**, — вельмі здзівіла тое, што за такі кароткі тэрмін мінчане змаглі занава пабудаваць свой горад. У выдатнай сталіцы рэспублікі вельмі многа прадпрыемстваў. У пачатку навучальнага года мы пабывалі на адным з іх — камвольным камбінаце.

— Ваша краіна рыхтуецца да вялікага свята — 50-годдзя з дня ўтварэння СССР, — гаворыць **Сісэй Альфа**.—І мне як будучаму геолагу вельмі цікава даведацца аб кожнай рэспубліцы, аб багаццях яе зямных нетраў. Мы цяпер у час вучэбных заняткаў чытаем заметкі ў газетах аб многіх рэспубліках і пачынаем разумець, якая гэта вялікая дзяржава і як дружна жывуць яе народы.

Хочацца пажадаць усім савецкім людзям сустрэць слаўнае 50-годдзе ўтварэння СССР новымі працоўнымі поспехамі. Няхай мацнее дружба паміж усімі народамі свету!

Інтэрв'ю правёў
**В. КАЛАДЗІНСКІ.**





**НА ЗДЫМКАХ:** студэнты з Сьера-Леоне ў вучобе і адпачынку. Фота М. Нечыпарэнкі.

# АБМЯРКОЎВАЮЦЦА ПРАБЛЕМЫ АФРЫКІ

*У VI інтэрнацыянальнай навуковай студэнцкай канферэнцыі па праблемах Афрыкі прынялі ўдзел студэнт юрфака БДУ Самір Шахін (Судан) і аспірант фізічнага факультэта Джон Джасціс Флетчар (Гана).*

*Абодвум прадстаўнікам нашага універсітэта ўручаны дыпломы ўдзельнікаў конкурсу на лепшую навуковую студэнцкую працу па праблемах Афрыкі.*

У пачатку красавіка ў Маскве ў Доме дружбы з народамі зарубежных краін адбылася VI Інтэрнацыянальная навуковая студэнцкая канферэнцыя па праблемах Афрыкі. Асноўная тэма яе— «Палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя праблемы сучаснай Афрыкі».

Канферэнцыя была арганізавана Пастаянным афрыканскім семінарам студэнтаў у СССР. Навуковае кіраўніцтва яе работай здзяйсняў Інстытут Афрыкі АН СССР. У канферэнцыі прыняло ўдзел больш 300 савецкіх і іншаземных студэнтаў, аспірантаў, і вучоных з 36 краін Афрыкі, а таксама Савецкага Саюза, ПНР і ГДР.

Удзельнікі канферэнцыі прыбылі ў Маскву з Мінска, Кіева, Адэсы, Львова, Баку, Ерэвана, Тбілісі, Іванава, Уладзіміра і Ленінграда. Яны прынялі ўдзел у рабоце 4-х секцый: сацыяльна-палітычных праблем; эканамічных праблем; праблем нацыянальна - вызваленчага, маладзёжнага і прафсаюзнага руху; гісторыі, ідэалогіі і культуры.

Удзельнікі канферэнцыі заслухалі 67 дакладаў і паведамленняў. Вострыя дыскусіі, якія выклікалі найбольшы інтарэс, разгарнуліся па пытаннях: тэарэтычныя і практычныя аспекты некапіталістычнага шляху развіцця; знешнія і ўнутраныя перадумовы развіцця грамадства па некапіталістычнаму шляху; роля рабочага класа, сялянства і палітычных партый.

У многіх выступленнях адзначалася падрыўная дзейнасць імперыялістычных дзяржаў у Афрыцы, накіраваная на звяржэнне прагрэсіўных урадаў у некаторых афрыканскіх краінах, на падтрымку расісцкіх рэжымаў на поўдні кантынента.

Канферэнцыя ў значнай меры садзейнічала пашырэнню зацікаўленасці да праблем афрыканскага кантынента сярод студэнтаў розных краін, умацаванню кантактаў і супрацоўніцтва паміж аддзяленнямі семінара ў розных гарадах СССР. Яна паслужыла справе ўмацавання дружбы паміж моладдзю Савецкага Саюза, Афрыкі, Азіі, Лацінскай Амерыкі і сацыялістычных краін.

Самір ШАХІН,
студэнт юрфака БДУ.

## НАША ДАВЕДКА

**ПАСТАЯННЫ АФРЫКАНСКІ СЕМІНАР СТУДЭНТАЎ У СССР** быў заснаван у 1962 годзе па ініцыятыве савецкіх і афрыканскіх студэнтаў, якія вучацца ў навучальных установах г. Масквы, і ў снежні 1972 г. будзе адзначаць сваё дзесяцігоддзе. У статуце семінара запісана: «Семінар ёсць навукова-грамадскае студэнцкае аб'яднанне, удзельнікі якога цікавяцца праблемамі Афрыкі». Студэнты сустракаюцца ў вызначаныя дні пасля заканчэння заняткаў у навучальных установах.

Вось асноўныя мэты, якія ставяць перад сабой члены семінара: азнаямленне з сучасным этапам і перспектывамі нацыянальна-вызваленчага руху ў Афрыцы; вывучэнне праблем сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця краін Афрыкі; азнаямленне афрыканскай моладзі з вопытам сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе; умацаванне дружбы і салідарнасці паміж студэнцтвам і моладдзю Афрыкі і СССР.

Студэнты, якія цікавяцца разнастайнымі аспектамі афрыканскай рэчаіснасці, аб'ядноўваюцца ў межах семінара ў навуковыя секцыі. Такіх секцый тры: сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем; гісторыі, этнаграфіі і культуры; маладзёжнага і студэнцкага руху.

Навуковае кіраўніцтва секцый здзяйсняюць навуковыя кансультанты, якія ствараюць навуковы савет афрыканскага семінара. Усе яны з'яўляюцца вядомымі савецкімі вучонымі-афрыканістамі.

Самае значнае мерапрыемства, якое праводзіцца семінарам, — гэта штогадовая інтэрнацыянальная студэнцкая канферэнцыя па праблемах Афрыкі.

У цяперашні час афрыканскі семінар аб'ядноўвае ў сваіх радах каля шасцісот студэнтаў, аспірантаў, стажораў і маладых вучоных з 43 краін свету.

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

**Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.**
**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**
АТ 01170 Заказ 482 **Тыраж 2 000 экз.**